**«ЦЯЦЕ́РКА»**, старажытная танцавальная гульня. Зафіксавана ў Смаргонскім раёне. Музычны памер 2/4. Тэмп хуткі. Удзельнікі гульні становяцца ў два рады: хлопцы — у адзін, дзяўчаты — у другі. Першая пара злучала рукі і падымала іх угору, утвараючы «вароты». Потым яны паварочваліся тварам адзін да аднаго і са злучанымі папранейшаму рукамі праходзілі ўздоўж рада дзяўчат (хлопец — з левага боку, дзяўчына — з правага). У канцы рада пара паварочвалася і такім жа чынам праходзіла ўздоўж рада хлопцаў на сваё месца. Пры гэтым дзяўчына з хлопцам прытанцоўвалі (крок нагадваў па шасэ) у такт музыцы і спявалі:

Я цяцерку пасу. Ух, я!
На пановым лугу. Ух, я!
А цяцерку пад мост. Ух, я!
Я цяцерку за хвост. Ух, я!...

Потым дзяўчына з пары («цяцерка») раптам кідала хлопца («цяцерука») і ўцякала ад яго, а той яе лавіў. Калі ўдавалася злавіць, хлопец і дзяўчына станавіліся апошнімі кожны ў свой рад. Гульня працягвалася, пакуль усе хлопцы і дзяўчаты не выканаюць ролі «цяцеркі» і «цецерука».

*С. В. Гуткоўская.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ